З архіўных крыніц

# ПЁТР МАШЭРАЎ: «...УЛІЧЫЦЬ ДЛЯ БУДУЧЫНІ»

## Як ліст Мікалая Матукоўскага паўплываў на кампазіцыю мемарыяла «Прарыў»

**У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у пошце Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусь Пятра Машэрава захоўваюцца і лісты, у якіх пісьменнікі, мастакі, дзеячы культуры выказвалі сваю пазіцыю, уласныя, часам вельмі суб'ектыўныя, меркаванні ў частцы ацэнкі тых ці іншых твораў мастацтва, помнікаў, архітэктурных рашэнняў...**

Адзін з такіх зваротаў — ліст **Мікалая Ягоравіча МАТУКОЎСКАГА (1929—2001), беларускага драматурга, журналіста**. Нарадзіўся Мікалай Матукоўскі на Расоншчыне, у вёсцы Калюціна. Скончыў Тродавіцкую сярэднюю школу. Працаваў у Расонскім райкаме ЛКСМБ, у расонскай раённай газеце «Сацыялістычная праца». Завочна скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1956). У 1952—1960 гадах М. Матукоўскі працаваў у газеце «Звязда»: літработнік, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва. У 1960—1964 гадах — галоўны рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. У 1964—1966 гадах — галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР.

і стала бяссмерцем». Пасля дарогу абступаюць бетонныя сцены. На іх замацаваны бронзавыя пласціны з назвамі партызанскіх брыгад, якія ўдзельнічалі ў прарыве. А напрыканцы, на ўзгорку, у разрыве бетоннай сцяны-глыбы (вышыня 11 метраў), што, відавочна, з'яўляецца сімвалам прарыву кальца блакады, — дзевяціметровая бронзавая фігура партызана з аўтаматам. На верхняй пляцоўцы, справа ад скульптуры, пахаваны 450 партызан з ліку тых, што загінулі ў час прарыву. Устаноўлены пліты з імёнамі 1452 удзельнікаў прарыву... На ўзгорку пасаджаны 16 дубоў, якія сімвалізуюць мужнасць байцоў 16 партызанскіх брыгад...

З ліста М. Матукоўскага (дарэчы, без даты, праставленай «известинцем»; а ў ЦК зарэгістраваны зварот 18 чэрвеня 1974 г.): *«Паважаны Пётр Міронавіч!*

*На пачатку я хацеў было папрасіць у Вас паўгадзіны на размову, але, падумаўшы пра Вашу гранічную занятасць, вырашыў ужыць маналог у пісьмовай форме. З'яўляючыся глыбока перакананым у важкасці пытання, пра якое збіраюся весці размову, проста не магу не падзяліцца з Вамі сваімі меркаваннямі і сумненнямі.*

*Каб напісаць эпітафію да Ушац-*



Фота БелТА

сілы нямецкае арміі, адцягваючы іх ад Полацка. Шкада, што не паспеў сказаць гэтага пры жыцці сябру свайму...»

З ліста М. Матукоўскага: *«...Вось гэтыя заўвагі, якія я цяпер выношу на Ваш суд.*

*1. Бетонная сцяна, якая сімвалізуе нямецкае кальцо блакады, абсалютна нейтральная, індыферэнтная, што, з майго пункту гледжання, недапушчальна ў такога характару збудаванняў. Яна не мае ніводнай дэталі, якая паказвала б на тое, што гэта сцяна — можна выправіць, скажам, замяніць «непаэтычныя» дубы «паэтычнымі» ялінкамі. Некаторыя ж пралікі праекта сыдуць на многія дзесяцігоддзі, стануць «здабыткам» нашых унукаў і праўнукаў, якія непазбежна будуць людзьмі эстэтычна болей граматнымі, чым сённяшняе пакаленне. Што яны будуць думаць пра нас, гледзячы на мемарыял, які закліканы ўвекавечыць мужнасць, гераізм, бессмяротнасць?..»*

Але гэтымі ацэнкамі высокапастаўлены, пры сур'ёзнай пасадзе,

І ўсё ж — развагі Мікалая Матукоўскага: *«...Параўнанні ў мастацтве — рэч небяспечная і непатрэбная і ўсё ж такі: няўжо А. С. Пушкін меней геніяльны, чым Я. Купала ці Я. Колас?.. Успомніце помнік Пушкіну (стаціць перад «Известиями»), зроблены Анікушыным, крыху большы, чым натуральны чалавечы рост, ці помнік таму самаму А. С. Пушкіну, зроблены Анікушыным у Ленінградзе. Нядаўна ў Кішынёве пастаўлены помнік Пушкіну памерамі нават меней за чалавечы рост. Але каля яго заўсёды натоўпы людзей.*

*І ўжо, канешне, Фальконэ мог бы зрабіць Пятра Вялікага ў літаральным сэнсе бронзава-вялікім, але ён толькі крыху павялічыў натуральныя памеры каня і самога Пятра. Ён цудоўна разумеў, што камень, граніт здольны быць глыбай, бронза — ніколі! Бронза, як і мармур, патрабуюць вытанчаных, зграбных форм і, зразумела, вызначаных маштабных прапорцый.*

*Чаму ж нараджаюцца «гіганты» ў сучасных дойлідаў? Мне думаецца, што гэта ідзе перш за ўсё ад творчай нездольнасці «ўразіць» гледача зместам, таму аўтары «ўражваюць» яго маштабамі, памерамі. Дыскутаваць з імі чалавеку недасведчанаму вельмі няпроста. Янка Купала вялікі! Канешне ж!*

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы